УДК 882.6-09 +378.01

Т. М. Федарцова, дацэнт

# ІНФЕРНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ І ТЭМЫ Ў СУСВЕТНАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ

The article contains information on development of infernal problems and themes in Belarusian and world literature.

Беларускае мастацкане слова з'яўляецца спадкаемнікам Візантыйскай літаратуранай спадчыны, якая прадстаўлена двума кірункамі – кананічным і некананічным і значнай жанравай разнастайнасцю. Да кананічнай літаратуры адносіліся ўсе богаслужэбныя кнігі. Да некананічнай – жыцці, агіяграфіі, патрыстыка, хронікі, словы, гістарычная проза, мемуары. Выдаваліся агіяграфічныя зборнікі: мінеі, пралогі або сінаксары, пяцерыкі і інш.

Сярод жанраў візантыйскай паэзіі вылучаюцца царкоўныя ***гімны***. Вядомым іх стваральнікам быў сірыец Раман Сладкапевец (VI ст.), які напісаў каля тысячы вершаў дадзенага жанру. Гімны Рамана адрозніваліся аскетычным характарам, шчырасцю і глыбінёй пачуццяў. Яны напісаны ў свабоднай форме, сярэдняй паміж метрычным і празаічным маўленнем і блізкія да ***псалмаў*** як па форме, так і па змесце. Раман Сладкапевец разглядаў семіятычныя элементы Старога Запавету, каб прыладзіць галоўныя матывы да тэксту Новага Запавету, супаставіць падзеі, параўнаць біблейскія персанажы. Семіётыка – гэта навука, якая вывучае найбольш агульныя ўласцівасці знакаў і знакавых сістэм. Але ў гімнах тагачаснага славутага візантыйскага паэта дагматызм і багаслоўская вучонасць часам прытушвалі жывое пачуццё, а залішні дыдактызм перашкаджаў развіццю мастацкасці паэзіі. Сёння ў агульнай скарбонцы сусветнай літаратуры значацца духоўныя паэтычныя творы Канстанцінопальскага патрыярха Сергія, вядомага багаслова і выбітнага паэта Іаана Дамаскіна, які, дарэчы, стварыў тэорыю «свяшчэннага абраза», даказаўшы іконаборцам, што нябачная і бесцялеснае святое можна адлюстроўваць у сімвалічным і алегарычным выглядзе. Істотны ўклад у агульную справу ўнеслі і іншыя аўтары прыгожага слоўнага мастацтва Візантыі. Менавіта гэтыя творцы распрацавалі і распаўсюдзілі ў літаратурах еўрапейскіх краін інфернальную тэму (тэму пякельных пакут), якую цудоўна абагульніў вялікі Дантэ ў сваёй «Боскай камедыі».

Паэма з'явілася у той час, калі чалавецтва ўжо некалькі стагоддзяў жыло ў хрысціянстве, але ў сваіх вераваннях яно было яшчэ недалёка ад паганскіх традыцый. Таму Дантэ шукае паміж імі сувязі і прыхавана (бо гэта было вялікім грахом!) імкнецца паяднаць веру ў Хрыста і мнагабожжа.

Твор мае выразна акрэсленую кампазіцыю, якая складаецца з трох вялікіх частак (або канцікаў): «Пекла», «Чысцец», «Рай». Кожны канцік мае 33 песні, і калі дадаць уступную песню, то атрымаем лік сто. Сімволіка ідэальных лікаў: 3, 33, 100. Тры – паўтаральнасць дзеяння, як у казках (тры дні і тры ночы), 33 – узрост Ісуса Хрыста, 100 – век чалавечага жыцця.

«Боская камедыя» мае і антычныя крыніцы. У першую чаргу, «Энеіду» Вяргілія. Ды і саму асобу Вергілія Дантэ ўзяў у якасці павадыра (гіда) па пекле і чысцы. У аснову паэмы пакладзены распаўсюджаны ў эпоху Сярэднявечча жанр – бачанне, з яго дапамогай чалавек быццам мог бачыць таямніцы таго свету. Сонбачанне пачынаецца ў перадвелікодную пятніцу 1300 года.

У час цяжкі, у момант паваротны
Свайго жыцця, згубіўшы верны шлях,
Я трапіў нечакана ў лес дрымотны.
Слоў не знайсці, каб выказаць мой жах,
Бо выклікаюць нават успаміны
Пра гэты лес намнога большы страх,
Чым уяўленне ўласнай дамавіны.
[1, с. 5]

Тры царствы таго свету, якія сімвалізуюць зямное жыццё, перабудаваны ў строгай адпаведнасці з ідэяй строгай справядлівасці. Папа, што змагаўся з гібелінамі, знаходзіць месца ў Пекле. А Брут і Касій, якія здрадзілі Юлію Цэзару, аб'яўляюцца найвялікшымі злачынцамі, накшталт хрыстапрадаўцы Іуды.

Пекла ў славутай паэме паказана як конусападобная варонка, вялікая яма, западзіна да самага цэнтра Зямлі, якая звужаецца ўнізе і ўпіраецца ў студню, на дне якой умерз у лёд Люцыпар, а з яго трох пастак тырчаць змучаныя целы найвялікшых здраднікаў у гісторыі чалавецтва – Іуды Іскарыёта, Брута і Касія. Тут на дзевяці колах мы сустракаем шэраг людзей з рознымі слабасцямі і заганамі, якія пакутуюць за свае грахі. Гэта наватарства. Бо ўпершыню ў заходнееўрапейскай літаратуры менавіта Дантэ паказаў першапрычыны грахаводнасці чалавека – ягоную упартую кідкасць на недазволенае, спакуслівасць і хцівасць. Каб паказаць гэтыя заганы, аўтар спускаецца ў Пекла. Ды толькі замагільны свет не супрацьпастаўляецца рэальнаму жыццю, а быццам працягвае яго. Тут адбываюцца і палітычныя спрэчкі (у пекла Дантэ адпраўляе сваіх палітычных ворагаў. А ў рай – сваіх сяброў). Малюнкі рэальнага жыцця, такім чынам, пераносяцца паэтам у Пекла, дзе пануе змрочны каларыт, дамінуюць чырвоны і чорны колеры і розныя іх адценні. Грэшнікі таксама

паводзяць сябе па-рознаму: адны прыніжаюцца, укленчваюць, запабягаюць, другія – грэбліва ставяцца да сваіх умоў і да самога Пекла, трэція – мужна, цярпліва, годна нясуць свае пакуты. Адны маўчаць, а другія лаюцца:

Вясляр бліжэй да берага прыгроб –
І стомленыя, голыя істоты,
Скрыгочачы зубамі, узахлёб
Выкрыкваць сталі розныя брыдоты
Пра родны край, пра Бога, пра бацькоў,
Пра чалавецтва – зборышча басоты.
[1, с. 9]

Ці не праўда, даволі знаёмая карціна? Людзі наракаюць на ўсё, усім незадаволены. А ў Бібліі ж сказана, Не наракай! Цярпі! Не асуджай! І ты будзеш неасуджаны!

Чым ніжэй размешчана кола, тым больш суровыя пакуты церпяць грэшнікі. У верхнім пекле (першае – пятае кола) пакаранне нясуць тыя, хто безаглядна раяваў пры жыцці, не ўмеў стрымліваць сябе ад спакусаў, хто быў скнарлівым, зайздросным, злосным. Там жа адведзена месца праведным грэшнікам: героям, імператарам, мудрацам і паэтам антычнасці. Тут мы сустракаем Гамера, Эсхіла, Гарацыя, Авідзія і іншых творчых асоб, бо ўсе яны, як і Вергілій, паганцы. Паэты няспешна гуляюць па зялёным лузе, абмежаваным сценамі высокага палаца і бавяць час у свецкіх гутарках. Мукі ім не прысуджаны, але яны самотныя, бо ім наканавана навечна заставацца ў поўным змроку, паколькі пры жыцці былі пазбаўлены святла хрысціянскай веры.

У больш жорсткім, жудасным, цьмяным ніжнім пекле, агароджаным наглуха моцнымі жалезнымі сценамі д'ябальскага горада Дыта, знаходзяцца душы тых людзей, хто здзейсніў зло ўсвядомлена. Напрыклад, у шостым коле размешчаны вогненныя труны ерэтыкоў. У трох паясах жахлівага сёмага кола нясуць цяжкія пакаранні тыраны, богазневажальнікі, забойцы і самазабойцы. Богазневажальнікаў спальвае вогненны дождж, тыраны і забойцы захлынаюцца ў кіпені пралітай імі крыві. Галінкі шматлікіх дрэваў, у якія ператвораны самазабойцы, жорстка ламаюць птушкі-гарпіі.

Восьмае кола складаецца з дзесяці Злых Шчылін. Тут нясуць пакаранне падманшчыкі, зваднікі, хабарнікі, мянялы, казнакрады ліхвяры, падбухторшчыкі грамадзянскіх войнаў, чарадзеі і магі. Па волі Дантэ тут пакутуюць заснавальнік ісламу Мухамад, мноства рымскіх пап, гістарычных дзеячоў і нават літаратурных персанажаў.

Дзевятае кола, на дне якога застыла жудаснае ледзяное возера-балота Кацыт, падрыхтавана для тых, хто здзейсніў самы пякельны грэх – здрадзіў родным, айчыне, аднадумцам. Дантэ не знаходзіць апраўдання здраднікам нацыянальнага духу, таму і пакаранне такім асобам ён прыдумвае самае жорсткае. Цікава, што гэты матыў традыцыйна выкарыстоўваюць шматлікія іншанацыянальныя літаратуры, якія пастаянна звярталіся да творчасці Дантэ. Напрыклад, М. Багдановіч узяў эпіграфам да цыкла вершаў «У зачараваным царстве» словы з IX Песні «Пекла» дантаўскай «Боскай камедыі» і пакінуў іх без перакладу, чым дасягнуў полівалентнага прачытання цыкла. Такі прыём часта ўжывалі сімвалісты, але Максім-Кніжнік такім чынам скіроўвае свайго чытача да пошуку новых кантэкстаў. Дантэ Аліг'еры, з творчасцю якога Багдановіч быў добра знаёмы, даў яму ўрок высокай мастацкасці.

Як бачым, беларуская літаратура не пазбегла інфернальнай тэмы. Плачы, ляманты, трэнсы, як жанравая разнастайнасць, бытавалі ў беларускай фунеральнай паэзіі XV–XVI стагоддзяў. Для іх ужо былі характэрнымі філасофскія матывы і адначасова глыбокі лірызм. Роздумы паэтаў пра хуткаплыннасць чалавечага жыцця і непазбежнасць смерці абапіраліся на традыцыйную хрысціянскую тэалогію, але зрэдку сягалі і да антычнай мудрасці. Самай папулярнай формай жалобнага верша быў ***эпіцэдыум.*** Адным з найлепшых твораў з'яўляецца напісаны Габрыэлем Белазорам «Эпіцэдыум на пахаванне Ганны Дарагастайскай» (Вільня, 1596). Яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя Аляксандр Мацяёўскі адзначаў высокі паэтычны ўзровень гэтага твора і цытаваў ягоны пачатак у сваёй кнізе.

Самым грандыёзным па задуме фунеральным творам у паэзіі Вялікага княства Літоўскага XVI стагоддзя лічыцца выбітная паэма Станіслава Кулакоўскага «Катамерынон Слуцкага княства з жалобным лямантам на заўчасную смерць слаўнай памяці княжат слуцкіх: Юрыя, Яна Сімяона і Аляксандра, апошніх уладароў» (Вільня 1593) Адчувальна, што галоўнай мэтай С. Кулакоўскага было не толькі ўшанаванне памяці заўчасна памерлых братоў, але і аплакванне канчатковага згасання ўсяго старадаўняга роду Алелькавічаў, а таксама – апраўданне пераходу спадчыны славутых князёў слуцкіх да роду Хадкевічаў. Аўтар звярнуўся да драматызаванай формы, увёў у твор алегарычныя постаці відных дзеячоў Слуцкага княства.

Барочная эстэтыка прызнавала два віды руху: «вертыкальны» – ад зямлі да ўсявышняга і «гарызантальны» – ад калыскі да магілы. Першаму віду адпавядала тагачасная духоўная паэзія, другому – свецкая. Свецкая паэзія часта збліжалася з духоўнай, запазычвала ў яе асобныя матывы. Але паміж імі была і вельмі істотная розніца. У параўнанні з рэлігійна-панегірычнай паэзіяй больш свецкі і дэмакратычны характар мела павучальная грамадска-філасофская лірыка, У цэнтры гэтай лірыкі –

роздум пра чалавека, яго прызначэнне ў жыцці. Яе галоўны герой – не рэнесансавы гарманічны чалавек, а асоба экзальтаваная, раздвоеная, надламаная. І ўсё ж духоўныя і фізічныя дабрачыннасці – вера, працавітасць, сумленнасць – прызнаюцца галоўнай мэтай чалавечага існавання, хаця адначасова герой не супраць таго, каб мець ад жыцця ўсе асалоды.

Супастаўленне твораў Сімяона Полацкага, Філафея Утчыцкага, Ігната Іяўневіча і некаторых з іх вучняў дазваляе нам сёння гаварыць пра існаванне (акрамя нясвіжскай) асобнай паэтычнай школы полацкага барока.

Але ж не толькі Полацк і Нясвіж далі нашай літаратуры цікавых паэтаў барока. Адным з прадстаўнікоў паэзіі высокага «штілю» быў Андрэй Белабоцкі. Вучыўся ён у Слуцку, а потым у адным з універсітэтаў Заходняй Еўропы. Вярнуўшыся на радзіму, аддана служыў прапаведнікам у Слуцку, пасля настаўнічаў у Магілёве. Белабоцкі вядомы нам як аўтар вялікай паэмы «Пентатэугум» («Пяцікніжжа»). У гэтым тыпова барочным творы шырока выкарыстоўваецца антытэза – паэтычны прыём супрацьпастаўлення процілеглых з'яў і паняццяў: высокага і нізкага, абстрактнага і канкрэтнага і г. д. Надзвычай вобразна апісвае А. Белабоцкі відовішча Нябеснага Суда, які ён абяцае кожнаму, у тым ліку «царам, князям з баярамі, вяльможам купна з рабамі». Такім чынам, паэма «Пентатэугум» – гэта працяг інфернальнай тэмы ў свецкай паэзіі, якая далей будзе распрацоўвацца ў кантах ці кантычках.

У 1914 годзе Марцінам Кухтам у Вільні была выдадзена «Кантычка». У яе рэдкім экземпляры, які яшчэ захаваўся да сённяшняга дня, на старонках 45–59 ёсць старадаўняя, хутчэй за ўсё складзеная ў пачатку XVIII стагоддзя, «Песня пра Лазара». Гэты твор мае выразныя жанрава-стылявыя рысы барока (парадаксальнасць, нечаканасць, кантрастнасць, алегарычнасць), ды і вызначаецца сацыяльным зместам, бо асуджае не столькі багацце, як скнарасць: дарэмна Лазар звяртаецца да брата за дапамогай. У адказ ён чуе абразлівыя словы Але, ў рэшце рэшт, дабро ўзнагароджана, а зло пакарана. Праўда, справядлівасці ў тагачасным феадальным свеце не было. А таму невядомы нам аўтар і не чакаў яе ад караля, князя ці суда. Заставалася толькі адна ўсцешная надзея – на суд звышнатуральных сіл. І яны ўзнеслі Лазара на неба, а пана кінулі ў пекла.

Тая ж самая прывідная жаданая надзея на справядлівасць, што наступіць хаця б пасля смерці, хаця б пры сканчэнні свету, гучыць у вершы «Аб страшным судзе». Невядомы нам аўтар яскрава і ярка малюе жахлівыя апакаліптычныя карціны «апошняга суда», дзе адмысловае пакаранне спасцігае багатых, але чэрствых людзей. Як і «Песня пра Лазара», духоўны верш «Аб страшным судзе» завяршаецца справядлівым пакараннем для тых, хто правёў жыццё марна, у гультайстве ды баляванні. У абодвух творах як нешта само сабой зразумелае сцвярджаецца, што дзе беднасць – там дабрыня і цнатлівасць, а дзе багацце – там злосць і амаральнасць.

Такія ж народныя ўяўленні аб добрым і злым выявіліся ў вершы Францішка Багушэвіча «Быў у чысцы!» Такім чынам, у «Песні пра Лазара» і духоўным вершы «Аб страшным судзе» пачатак старадаўняй народнай традыцыі, а ў Багушэвіча – яе працяг, бо ў чысцы галоўны герой таксама бачыць усталяванне жаданай справядлівасці:

З мужыкоў тут не надта каб шмат,
А ўсё больш дык багатых паноў.
На зямлі адцярпеўшы, наш брат
На той свет, як па масле, пайшоў.
А панам дык і трудна цярпець
Без прывычкі, дык стогнуць, аж страх!
[2, с. 68]

Чалавек уладкаваны так, што заўсёды прагне практычнага ўвасаблення лепшага вопыту. Беларускія творцы часта выяўляюць сваё пісьменніцкае крэда творчасцю сваіх славутых папярэднікаў эпох Сярэдневечча, Адраджэння і Барока. Максім Танк у 1971 годзе ў адным са сваіх верлібраў напісаў наступнае:

Аднойчы я ішоў з Дантэ
Па спіралях пекла.
І ён дзівіўся,
Што з часоў апошняе вандроўкі
У царстве ценяў
Прыбавілася столькі новых
І невядомых
Яму кругоў.

Паглыбленне апакаліптычных настрояў заўважна ў беларускай літаратуры канца XX стагоддзя ў апавяданнях Андрэя Федарэнкі, Алеся Наварыча, Адама Глобуса, Уладзіміра Сцяпана, Вінцэся Мудрова, Барыса Пятровіча, Пятра Васючэнкі Юрыя Станкевіча, і інш. Удала скарыстаў апакаліптычныя матывы ў сваім рамане «Катастрофа» Эдуард Скобелеў.

Тэма пякельных пакут прасочваецца і ў гістарычным рамане «Храм без Бога» маладога творцы Вітаўта Чаропкі.

Такім чынам, дадзеная тэма зяўляецца актуальнай і непазбежнай для сучаснай літаратурнай крытыкі.

**Літаратура**

1. Дантэ, А. Боская камедыя / А. Дантэ. – Мінск, 1997. – С. 5–9.

2. Багушэвіч, Ф. Творы: вершы, паэмы, апавяданні, артыкулы / Ф. Багушэвіч. – Мінск, 1998. – С. 68.